# РОЛЯ МІФАЛАГЕМЫ "САД" У РАМАНАХ В. КАЗЬКО

**Г.Г. Мігай**

Некалі нямецкі даследчык Фрай прапанаваў успрымаць літаратуру перапляценнем параўнальна абмежаваных і простых формул, якія можна выявіць нават у прымітыўных культурах. Ён разглядаў літаратуру ў цэлым як сістэму тыпалагічных зваротных сувязяў, што не толькі ускладняюцца ў часе, але і распаўсюджваюцца ў паняційнай прасторы ад нейкага цэнтру, які вызначаецца літаратуразнаўчай тэорыяй. Гэтая прастора, на думку вучонага, ахоплівае не біяграфічныя крыніцы літаратуры, а, наадварот, яе надасабовыя і абагулена сімвалічныя характарыстыкі[1]. Менавіта апошнія і утвараюць сувязі з пратыпічнымі працэсамі, якія працякаюць ў падсвядомасці, а міфічны пачатак той жа літаратуры выступае ў якасці кода для безасабовай прыроды мастацкага твора. Вядомы нямецкі літаратуразнавец Р.Вейман адзначыў, што аналіз эпічных ці драматычных феноменаў у плане іх дзеяння павінен быць накіраваны на высвятленне нешматлікіх і простых па форме прататыпаў[2]. Паспрабуем разгледзець раманы сучаснага беларускага пісьменніка В.Казько, які свае паэтычныя канструкцыі зводзіць да жанравай умоўнасці і адсылае чытача да правобразаў.

Адным з асноўных архетыпаў, якія В.Казько выкарыстоўвае ў сваіх эпічных творах, з'яўляецца вобраз Саду. Найбольш поўна гэтая міфалагема раскрываецца і інтэрпрэтуецца ў рамане пісьменніка "Хроніка дзетдомаўскага саду"(1986), у часопісным варыянце — "Сад, альбо Заблытаны след рамана". Гэтая метафара сустракаецца і ў двух іншых раманах творцы — "Неруш"(1983) і "Бунт незапатрабаванага праху"(2000).Так, назва асноўнага месца дзеяння першага з іх адсылае чытача да галоўнейшага саду свету — Княжбору, а відазменены вобраз саду — лес — выступае ўвасабленнем адначасова прыроднай гармоніі (нават са знакам "мінус"[3] )і чалавечай недасканаласці ў апошнім рамане пісьменніка . В.Казько спрабуе праз сінтэз хрысціянскага міфа аб набыцці і страце чалавекам зямнога раю і язычніцкіх вераванняў узняцца над рэ-

чаіснасцю. Тым больш, што такая міфалагічная фантастыка дае творцу волю ў асэнсаванні гісторыі.

Выкарыстоўваючы міф у якасці галоўнай сілы, якая ўтрымлівае веды, аўтар надае дзеянням галоўных герояў другога рамана Мар'яна Знаўца і Сідара Місцюка значэнне рытуалу. На думку Н.Капшай, пачатак першага з іх ідзе ад бунтара, мучаніка ідэі Каіна, а Місцюк з'яўляецца нашчадкам пакорнага, баязлівага Авеля [4]. І калі асноўную сваю задачу Мар'ян зводзіць да аднаўлення саду жыцця, Сідар выконвае ролю яго знішчальніка. Такую рытуальнасць В.Казько суадносіць з арыстоцелеўскім азначэннем міфа, які падаецца як "фабула" ці "дзеянне". Аднак значную частку тэарэтычнай асновы рамана "Хроніка дзетдомаўскага саду" займае тое разуменне міфа, калі сутнасць чалавека спасцігаецца глыбей, чым толькі як суб'екта гісторыі, раскрываюцца "перспектывы фантазіі і памкненняў", у тым ліку і "імкненне выйсці за межы цяперашняга імгнення"[5]. Такім чынам, зварот В.Казько да славянскай міфалогіі , і дакладна да праваобраза саду ,становіцца асновай новага падыходу празаіка да гісторыі свайго народа, стварэння адметнай паэтычнай сістэмы

Паняцце нацыі пісьменнік асэнсоўвае якраз праз згаданы сімвал. Дзякуючы яго шматзначнасці, аўтар смела праецыруе яго на самога індывіда, стан яго душы і цела, а таксама прастору і час чалавечага існавання. На падставе даследаванняў па міфалогіі мы прапануем наступныя варыянты тлумачэнняў акрэсленай міфалагемы, выкарыстаныя ў рамане "Хроніка дзетдомаўскага саду":

1. Сад – адпаведнік хрысціянскага паняцця раю, што ўспрымаецца першнаперш як псіхалагічны і фізічны стан асобы, які суадносіцца з азначэннямі шчасця і плоцкай асалоды.

2. Сад – увасабленне самога грамадства ў якасці адзінства індывідуальнага і калектыўнага, дзе вобраз пладавітага дрэва адлюстроўвае сацыяльную ролю асобы.

3. Сад – пэўная прастора, далёкая і цяжкадасягальная краіна, у межах якой пануюць свае, няхай і утапічныя законы, што аднолькава істотна ўплываюць на рознага кшталту людзей.

4. Сад – мадэль часу, дзе паняцце вечнасці рэалізуецца праз чаргаванне пасадкі і высечкі, тым больш што цыклічнасць гэтых працэсаў абумоўліваецца самім чалавекам, які і вызначае сутнасць часу.

5. Сад – метафара жыцця кожнага канкрэтнага чалавека, каштоўнасць існавання якога залежыць ад умельства "абрабляць свой сад".

Перапляценне сімвалічных значэнняў названай міфалагемы ў рамане "Хроніка дзетдомаўскага саду" дапамагаюць В.Казько перадаць невырашальнасць супярэчнасцей паміж жыццём і ведамі. Пры гэтым пісьменнік выкарыстоўвае ідэю развіцця Ф.Ніцшэ, паводле якой "вучэнне аб суверэнным станаўленні сапраўднае, але смяротнае"[6]. Аўтар яшчэ раз падкрэслівае, што толькі далягляд, перспектыва, ахутаная неўміручымі міфамі, надае культурнаму развіццю цывілізацыі адзінства і завершанасць.

Наогул, у цэнтры паэтычнай сістэмы В.Казько знаходзіцца свяшчэннае дрэва, якое выступае ў рамане паменшанай копіяй Сусвету, яго стрыжнем. Ар-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хетып дрэва, як лічыць А.Ненадавец, з'яўляецца найвялікшым дасягненнем вусна-паэтычнай творчасці, бо менавіта гэты вобраз вызначыў сабой структуру ўсіх міфалагічных сістэм[7]. Творца выкарыстоўвае вертыкальную структуру дрэва, звязаную з касмагоніяй, і гарызантальную, што пераклікаецца з рытуальнымі дзеяннямі галоўных герояў рамана, для пабудовы ўласнай мадэлі свету. Такая пазіцыя В.Казько як бы падмацоўвае слушнасць пераканання погляду Р.Веймана аб тым, што "вобразы міфа павінны быць усюдыіснымі і нябачнымі дэманічнымі ахоўнікамі, пад пільным вокам якіх падрастае маладая душа,па закону якіх мужчына выбірае свой жыццёвы і свой баявы шлях, і нават дзяржава не ведае больш магутных няпісаных законаў, чым міфічныя асновы".[8]

Літаратура:


1. Вейман Роберт. История литературы и мифология. М., 1975. С.247.
2. Там жа. С.255.
3. Козіч В.І. Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе. Мн.,1998. С.6.
4. Капшай Н.П. Чалавек і сусвет у рамане В.Казько "Хроніка дзетдомаўскага саду" // Бел.літ. С.109.
5. Вейман Роберт. История литературы и мифология. С.263.
6 Там жа. С.272.
7. Ненадавец А.М. Каму пакланяліся продкі. Мн., 1996. С.63.
8. Вейман Роберт. История литературы и мифология. С.272.


ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ